ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

…УРНАЯ

…чзіі

…а, …і …а- …та …т- …й- …м- …ці …на

плане, вобразаў як Сотнікаў, як Іваноўскі («Дажыць да світання»), як Мароз («Абеліск»), а адлюстраванне жыцця такім, як яно ёсць. З усімі складанасцямі і супярэчлівасцямі... Другой састаўной часткай сістэмы тыпізацыі ў рамане з'яўляецца сапраўд-

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# І…ЕЛЬСКІ У…ЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 20 (656) | Аўторак, 2 чэрвеня 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Лекцыйная прапаганда: вопыт і праблемы перабудовы*

# БЕЗ ШАБЛОНУ

XXVII з'езд КПСС паставіў задачу: надаць сацыяльна-эканамічнаму развіццю грамадства дынамізм і паскарэнне. Яна ж патрабуе і перабудовы лекцыйнай прапаганды, напаўнення подыхам жыцця заклікаў і лозунгаў. Асноўны сэнс гэтай перабудовы заключаецца ў тым, каб шляхам узмацнення партыйнага кіраўніцтва лекцыйнай прапагандай, павышэння актуальнасці тэматыкі чытаемых лекцый, паляпшэння саставу лектарскіх кадраў істотна павысіць якасць і дзейснасць лекцыйнай прапаганды.

На працягу апошніх гадоў у парткоме і праўленні таварыства «Веды» ішоў працэс набліжэння лекцыйнай прапаганды да патрэб жыцця, інтарэсаў працоўных калектываў, актыўны пошук аптымальных падыходаў да яе арганізацыі і планавання. Практыка паказвае, што поспех усёй работы залежыць ад умення знаходзіць і падтрымліваць новыя формы і метады лекцыйнай прапаганды на справе, быць у пастаянным кантакце з лектарскім актывам.

Ва ўніверсітэце створана новая арганізацыйная структура ўпраўлення лекцыйнай прапагандай. Канкрэтным праваднікам партыйнага ўплыву сталі арганізатары лекцый — новы ідэалагічны актыў партыйных камітэтаў. На арганізатараў лекцый ускладзены адказнасць за фарміраванне тэматыкі лекцый у выглядзе плакатаў-графікаў для адной або некалькіх аўдыторый, кантроль за іх рэалізацыяй. На жаль, арганізатары лекцый на факультэтах і ў інтэрнатах не заўсёды з належнай адказнасцю падыходзяць да гэтага пытання: склалі план-графік і забыліся аб ім. У выніку гэтага не былі прыняты лектары па прававому выхаванню на матэматычным факультэце, у інтэрнаце № 2, лектар-міжнароднік — у інтэрнаце № 1 ГДУ.

Адказна адносіцца да арганізацыі лекцыйнай работы са студэнтамі сакратар партбюро фізічнага факультэта Т. П. Жалонкіна. На факультэце сталі рэгулярнымі сустрэчы студэнтаў з юрыстамі, лектарамі па міжнароднай тэматыцы, па пытаннях маралі. Разам з лекцыямі і гутаркамі шырокае распаўсюджанне на факультэце атрымалі сустрэчы з цікавымі людзьмі, воінамі-інтэрнацыяналістамі, гутаркі за «круглым сталом», а таксама іншыя нетрадыцыйныя формы работы.

Ідзе няўхільнае, але, на жаль, маруднае вызваленне лектарскіх кадраў ад прывычкі весці валавы ўлік, адвольна заносіць у разрад лекцый гутаркі, палітінфармацыі і іншыя формы вуснага слова. У сувязі з гэтым за апошнія гады колькасць улічаных лекцый знізілася прыкладна на 25—30%, хаця сама лекцыйная прапаганда стала весціся больш актыўна. Не абмяжоўваюцца сёння толькі студэнцкай аўдыторыяй і гутаркамі па прафарыентацыі, як было два-тры гады назад, лектары па навукова-тэхнічнай і прыродазнаўчанавуковай тэматыцы. Больш ініцыятыўна чытаюць лекцыі перад аўдыторыямі слухачоў раёна і вобласці В. І. Талкачоў, А. В. Гаўрылаў, У. С. Стрыжнёў, М. І. Аляшкевіч, М. І. Жадан, С. М. Курылкіна, М. Ф. Паўлаў, Ж. А. Герасімава і інш. На жаль, гэтага нельга сказаць аб выкладчыках літаратурных і моўных кафедр гісторыка-філалагічнага факультэта. А поле ж для іх дзейнасці неабмежаванае, патрэбны толькі асабістая ініцыятыва і жаданне. Над гэтым варта падумаць і сакратару партбюро факультэта В. Ф. Маслюкову, і загадчыкам кафедр У. В. Анічэнку, П. У. Сцяцко, У. М. Сабаленку. Дапамога абласному інстытуту ўдасканальвання настаўнікаў не павінна замяняць актыўнае чытанне лекцый у працоўных калектывах, маладзёжных інтэрнатах, ПТВ, тэхнікумах і г. д.

Неабходна адзначыць, што арыентацыя на кардынальныя праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця патрабавала актывізацыі выступленняў лектараў па праблемах НТП, перадавога вытворчага вопыту, канкрэтнай эканомікі. І ў авангардзе зноў былі лектары-выкладчыкі кафедры палітэканоміі, сіламі якіх толькі ў 1986 г. было прачытана звыш 600 лекцый пераважна ў працоўных калектывах горада і вобласці. Цёплыя словы і запрашэнні прыйсці яшчэ і яшчэ заўсёды гучаць у адрас дацэнтаў У. Ф. Бондарава, Г. Д. Ветлугаева, Н. П. Пухавай, Т. А. Мальгіной, В. П. Галеева і інш. Іх лекцыі вызначаюцца не толькі добрым веданнем матэрыяла, выкарыстаннем новых даных і фактаў, але і ўменнем устанавіць добры кантакт з аўдыторыяй, выклікаць дыскусію, весці са слухачамі шчырую і карысную размову. Аднак,нашы лектары па канкрэтнай эканоміцы не дапрацоўваюць у даным пытанні і часта неахвотна адгукаюцца на запрашэнні і просьбы выступіць з лекцыяй. На гэта трэба звярнуць асаблівую ўвагу і старшыні пярвічнай арганізацыі таварыства «Веды» Т. Д. Трацэўскай, і сакратару партбюро эканомфака Т. В. Карпей.

Важную ролю ў рашэнні гэтай праблемы можа адыграць супрацоўніцтва арганізацый таварыства «Веды» факультэтаў і кафедр з вытворчымі калектывамі і сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі на аснове заключэння дагавораў аб творчым супрацоўніцтве. Такія дагаворы заключаюцца цяпер некаторымі кафедрамі ГДУ з Гомельскім тэхнікумам чыгуначнага транспарта, політэхнікумам, ПТВ-113, СПТВ-22 і інш. І рэзервы ў гэтым яшчэ вялікія.

Цеснае ўзаемадзеянне высокакваліфікаваных лектараў ГДУ з працоўнымі калектывамі стварыла ўмовы для пашырэння тэматыкі лекцый, пазбаўлення ад стандартаў у гэтай справе. Так з'явіліся лекцыйныя тэмы «Сацыяльна-псіхалагічныя праблемы кіравання ў працоўным калектыве», лекцыі па прыярытэтных напрамках сучаснай навукі (АСК, прымяненне ЭВМ у народнай гаспадарцы, выкарыстанне атамнай энергіі ў мірных мэтах і інш.) і звязаныя непасрэдна са спецыфікай вытворчасці (НТП і металаапрацоўка).

Перабудова лекцыйнай прапаганды ідзе складана, новыя падыходы і метады нялёгка прабіваюць сабе дарогу, таму неабходна прыкласці яшчэ нямала намаганняў, каб адбылася карэнны перелом, каб лекцыйная прапаганда стала адным з моцных каталізатараў актывізацыі чалавечага фактару ў рашэнні задач паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**В. СТАРАКОЖАВА,**
адказны сакратар таварыства «Веды» ГДУ,
член парткома.

*ДЗЁННІК СЕСІІ*

# ДЛЯ АДНЫХ—ФІНІШ, ДЛЯ ДРУГІХ—СТАРТ

Надышоў чэрвень. Гэта для студэнтаў самы гарачы месяц у поўным сэнсе слова. Тлумачыцца ён не толькі высокай тэмпературай лета, але і напалам душэўнага стану, выкліканага праверкай ведаў, атрыманых за вучэбны семестр.

Для асноўнай масы студэнтаў, пераводныя экзамены толькі пачынаюцца. А вось для будучых геолагаў, трэцякурснікаў спецыяльнасцей «Эканоміка працы» і «Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі» яны завяршаюцца. Гэта звязана з вучэбнымі і вытворчымі практыкамі.



Паспяхова здаў экзаменацыйную сесію староста гр. ЭТ-31 эканамічнага факультэта Леанід Радчанка.
Адзнаку «добра» паставіла яму на экзамене па эканоміцы прамысловасці дацэнт Т. Д. Трацэўская.

Фота А. Ульянкінай.

Радуюць грунтоўным веданнем вывучаемых дысцыплін трэцякурснікі эканомфака, асабліва па спецыяльнасці «Эканоміка працы». Нездавальняючыя адзнакі тут сталі крайняй рэдкасцю. Прыкладна палавіна студэнтаў здалі экзамены на «добра» і «выдатна». На ўсіх экзаменах вышэйшым балам ацэнены адказы Людмілы Сітнікавай, Уладзіміра Макаранкі, Генадзя Маторанкі.

Вызначылася сярод трэцякурснікаў і студэнтка гр. ЭТ-32 Антаніна Курыла, праўда, з адмоўнага боку. У журнале аб выніках здачы экзаменаў супраць яе прозвішча стаяць дзве нездавальняючыя адзнакі.

На гэтым тыдні завяршаецца экзаменацыйная сесія і ў геолагаў. Праўда, большасць акадэмічных груп здалі ўжо ўсе экзамены і ў бліжэйшыя дні пачнуць замацоўваць свае веды на практыцы.

Паспяховасць студэнтаў-геолагаў, як і ў папярэднія гады, не вызначаецца стабільнасцю. Адны з іх праяўляюць стараннасць і перажываюць пачуццё радасці ад вынікаў здадзеных экзаменаў, другія — наадварот. Перш за ўсё хочацца назваць прозвішчы тых, хто па-сапраўднаму даражыць гонарам факультэта, рыхтуецца стаць добрым спецыялістам. Як паведамілі нам у дэканаце геафака, добрыя і выдатныя адзнакі на бягучай сесіі атрымалі С. Разгуляева, І. Тупіцкі, А. Літвінчук з гр. Г-11, С. Каваленка, Н. Міраеўская, Г. Хімуля (гр. ГФ-11), У. Багдановіч, А. Васількоў, Т. Стружко (гр. Г-21), А. Доўба, В. Хмара (Г-31), муж і жонка А. і Г. Дворак, У. Каваленка, А. Пятрова (гр. Г-41).

Разам з тым на геалагічным факультэце нямала студэнтаў, якія дрэннымі адносінамі да вучобы, нядбайнасцю падводзяць свае калектывы. «Рэкардсменам» з'яўляецца другакурснік А. Коршунаў. Ён не здаў чатыры залікі і столькі ж экзаменаў. Па тры двойкі маюць на сваім рахунку трэцякурснікі І. Гоман і В. Манькова. А першакурснік І. Федчанка наогул не быў дапушчаны да сесіі.

Прыведзеныя факты, якія яшчэ не адлюстроўваюць поўнага стану паспяховасці на геафаку, тым не менш насцярожваюць. У перыяд перабудовы вышэйшай школы трэба шукаць шляхі для актывізацыі вучэбнай падрыхтоўкі кожнага студэнта, больш сур'ёзных адносін да авалодвання выбранай прафесіяй.

Сёлетні год для савецкіх людзей — асаблівы: мы адзначым 70-годдзе перамогі Вялікага Кастрычніка. Гэтаму слаўнаму юбілею паўсюдна рыхтуюць дастойную сустрэчу. Пачэсны абавязак студэнтаў прыйсці да свята з якасна новымі паказчыкамі, перш за ўсё, у вучобе і, натуральна, у грамадскай і працоўнай дзейнасці трэцяга семестра.

**Б. ВАЛОДЗІН.**





Хвалюючыя цяпер дні ў студэнтаў завочнага факультэта. Яны здаюць дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму, а на чарзе ў іх — абарона дыпломных работ.

НА ЗДЫМКУ: выпускнік спецыяльнасці «гісторыя» А. Лунь паказаў на дзяржаўным экзамене выдатныя веды.

Фота А. Ульянкінай.

*Навукова-метадычная канферэнцыя*

# ВЫКЛАДАННЮ ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН — ЯКАСЦЬ

Стварэнне прыродазнаўчанавуковай карціны свету, заснаванай на сучасных дасягненнях навукі аб прыродзе, ставіць вялікую колькасць тэарэтыка-пазнавальных, метадалагічных і светапоглядавых праблем, патрабуе ўкаранення новых метадаў і падыходаў у выкладанне традыцыйных прыродазнаўчых навук, мае на ўвазе павышэнне культуры мыслення студэнтаў-біёлагаў, іх уменне карыстацца дыялектычнай логікай.

У цяперашні час прад'яўляюцца пэўныя патрабаванні да кваліфікацыі спецыялістаў, якія, маючы высокі ўзровень прафесіянальнай падрыхтоўкі, павінны валодаць марксісцка-ленінскім вучэннем. Гэтыя пытанні разглядаліся на працягу года на філасофскім (метадычным) семінары супрацоўнікаў і выкладчыкаў біялагічнага факультэта.

Дыялектыка - матэрыялістычны светапогляд фарміруецца ў студэнтаў-біёлагаў як у працэсе вывучэння грамадскіх навук, так і ў перыяд асваення прыродазнаўчых навук, сярод якіх асабліва важнае значэнне маюць біялагічныя і хімічныя дысцыпліны. Так рашаецца задача па фарміраванню камуністычнага светапогляду, у аснове якой закладзена ленінская ідэя саюза філасофіі дыялектычнага матэрыялізму і прыродазнаўства.

Пытанням фарміравання камуністычнага светапогляду была прысвечана чарговая VIII навукова-метадычная канферэнцыя «Фарміраванне дыялектыка-матэрыялістычнага светапогляду ў студэнтаў у працэсе выкладання дысцыплін медыка-біялагічнага і хімічнага цыклаў». Яна прайшла нядаўна на біялагічным факультэце.

Канферэнцыю адкрыў загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін дацэнт А. І. Кіеня. У сваім уступным слове ён адзначыў, што навукова-метадычная канферэнцыя, якая з'яўляецца заключным вынікам работы філасофскага семінара біяфака, дае магчымасць абмяняцца думкамі па некаторых метадычных пытаннях, прыёмах фарміравання дыялектыка - матэрыялістычнага светапогляду ў студэнтаў-біёлагаў.

Пытанні міждысцыплінарнага падыходу ў вывучэнні прыродазнаўчых навук, сістэмнасці навучання і выпрацоўкі ў студэнтаў актыўных (а не толькі інфарматыўных) ведаў абмяркоўваліся ў дакладзе кандыдата філасофскіх навук А. І. Лойкі.

У выступленні кандыдата біялагічных навук А. В. Гаўрылава з кафедры батанікі і фізіялогіі раслін былі вызначаны ўзаемасувязі раслінных арганізмаў, дынаміка і заканамернасці гістарычнага развіцця, эвалюцыі арганічнага свету, а таксама шляхі фарміравання ідэалагічнай накіраванасці светапогляду ў студэнтаў у працэсе выкладання спецкурса «Геаграфія раслін».

Праблемы фарміравання дыялектыка-матэрыялістычнага светапогляду ў студэнтаў-біёлагаў пры вывучэнні фундаментальных біялагічных дысцыплін былі асветлены ў дакладах дацэнта кафедры заалогіі і аховы прыроды І. Ф. Расошка і аўтара гэтых радкоў. У іх разглядаліся пытанні паходжання і рухаючых сіл эвалюцыйнага працэсу на Зямлі.

У заключэнні выступілі сакратар партбюро факультэта В. А. Хількевіч і інш. На канферэнцыі былі выказаны практычныя рэкамендацыі па правядзенню канферэнцый такога тыпу і паляпшэнню выкладання фундаментальных прыродазнаўчых дысцыплін, у прыватнасці, ва ўмацаванні антырэлігійнай прапаганды.

**В. АРУЦЮНАВА,**
**адказны сакратар канферэнцыі, дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін.**



*У студэнцкіх творчых калектывах*

# МЕТКІЯ СТРЭЛЫ

Студэнцкі народны тэатр «Люстэрка» паказаў гледачам сваю новую работу — спектакль «Дзве стралы» па п'есе А. Валодзіна. Чарговая прэм'ера самадзейных акцёраў ГДУ стала сапраўдным святам для іх саміх і для гледачоў.

«Дэтэктыў каменнага веку» — такая падназва п'есы. І ў ёй закладзены глыбокі сэнс: узнімаюцца актуальныя праблемы сённяшняга дня — дабро і зло, захаванне гуманістычных адносін паміж людзьмі, а значыць і захаванне міру.

Перад намі паўстаюць продкі, якія жылі ў XII тысячагоддзі да нашай эры, калі яшчэ існавалі абшчыны на чале з галавой роду. Аўтар разам з акцёрамі тэатра выкрывае жорсткасць і падхалімства, баязлівасць і хлусню, двудушнасць і лёгкадумнасць. Той, хто глядзеў спектакль, беспамылкова вызначыў у асобе Чалавека бою жорсткасць і бесчалавечнасць — рысы, якія характэрны для фашызму. Увасабленнем двудушнасці і хлусні з'яўляецца вобраз Красамоўнага; падхалімства, ханжаства і лёгкадумнасць выкрываюцца ў вобразах Даўганосіка і Хадака.

Станоўчыя героі п'есы — Вушасты, Чарапашка і Галава роду. Мудры Галава роду разумее, што пасля забойства Доўгага, сярод яго людзей няма былой згуртаванасці і спакою, з'явілася паміж сародзічамі нейкая варожасць, ахвярай якой міжволі сталі Вушасты і Чарапашка. Адной светлай рысай, якая ўсплывае над багнай негатыўных з'яў, пануючых у родзе, паўстае каханне Вушастага і Чарапашкі. Менавіта гэта каханне ставіць іх вышэй плётак, падхалімства, жорсткасці.

Спектакль дае магчымасць рабіць вывад, што яшчэ ў глыбіні каменнага веку зарадзіліся тыя з'явы, якія сталі небяспечнымі сёння.

Пастаноўка студэнцкім тэатрам ГДУ п'есы А. Валодзіна, узнятыя праблемы ў якой актуальныя ў нашы дні, прымушае нас не заставацца раўнадушнымі да ўсіх заган, што існуюць паміж людзьмі.

Хочацца адзначыць ігру акцёраў В. Антоненкі (Вушасты) і В. Галавіной (Чарапашка). Гэта іх першыя галоўныя ролі ў тэатры. Прыемна, што рэжысёр «Люстэрка» дае магчымасць раскрыць свае здольнасці тым, хто прыйшоў у калектыў нядаўна.

Шчыра кажучы, мы чакалі лепшага выканання сваіх ролей В. Дубікам (Чалавек бою) і А. Скрыпкіным (Красамоўны). Папярэдні спектакль «Рэвізор», у якім яны былі заняты, засведчыў, што гэтыя самадзейныя акцёры могуць больш поўна выказаць сябе ў вобразе.

Наогул, спектакль пакінуў добрае ўражанне. Цудоўна, што сярод нас ёсць студэнты, якія захапляюцца тэатрам, працуюць над удасканаленнем свайго выканаўчага майстэрства, прыносяць задавальненне гледачам.

Хочацца пажадаць калектыву студэнцкага народнага тэатра плённай працы, поспехаў у творчых пошуках. Спадзяемся, што гэты калектыў будзе працягваць радаваць студэнцкую моладзь, а таксама жыхароў г. Гомеля і вобласці сваімі новымі спектаклямі.

**А. САВІЦКАЯ, Л. ФІСЮК,**
**студэнткі гр. БР-43 гісторыка-філалагічнага факультэта.**



**НА ЗДЫМКУ: сцэна са спектакля.**

**Фота С. Страіцелевай.**

# КОНКУРС ЗНАТАКОЎ ГІСТОРЫІ

На працягу тыдня на гістарычным аддзяленні гісторыка-філалагічнага факультэта праходзіў конкурс знатакоў гісторыі, прысвечаны 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. Ён праводзіўся ўпершыню. Галоўная мэта гэтага конкурсу заключалася ў выяўленні ведаў будучых спецыялістаў па гісторыі сваёй краіны ў розныя перыяды яе існавання.

Конкурс праводзіўся па курсах у вуснай і пісьмовай формах. Адказы былі як індывідуальнымі, так і калектыўнымі. Іх ацэньвалі выкладчыкі кафедры гісторыі СССР і БССР. Балы налічваліся толькі за правільныя і поўныя адказы. За дзве акадэмічныя гадзіны патрэбна было даць адказы на 15—20 пытанняў рознай складанасці.

Конкурс выклікаў вялікую цікавасць усіх студэнтаў-гісторыкаў. Пры падвядзенні яго вынікаў пераможцамі называліся па тры студэнты ад кожнага курса. Імі сталі С. Бурак, А. Макушнікаў, А. Зелянкова (I курс), В. Стома, Ж. Касцюкова, І. Сазон (2 курс), В. Міхедзька, Ю. Павадыроў, А. Саўчанка (3 курс), С. Ткач, С. Цітоў, Т. Саўчанка (4 курс).

Конкурс засведчыў, што пераважная большасць студэнтаў добра ведае шматвекавую гісторыю нашай краіны, аб тых падзеях, якія адбываліся на яе тэрыторыі. Выкладчыкі нашай кафедры пераканаліся, што гэта адна з найбольш эфектыўных форм паглыбленага вывучэння гістарычных дысцыплін будучымі спецыялістамі.

**М. САВІНСКАЯ,**
**асістэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.**

**СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў СТУДЭНЦКІХ ПАРТГРУПАХ**

# НЕ Ў АВАНГАРДЗЕ

Справаздачна-выбарны сход партгрупы, якая аб'ядноўвае сем студэнтаў-камуністаў 4—5 курсаў, адбыўся на эканамічным факультэце.

У справаздачным выступленні партгрупорга чацвёртакурсніка Аляксея Лішыка адзначалася, што студэнты-камуністы не праяўляюць той актыўнасці, якой патрабуе ад іх час. Застаецца нізкім узровень удзелу членаў партгрупы на грамадска-палітычную і вучэбную дзейнасць іх акадэмічных груп, усяго факультэта ў цэлым, слаба адчуваецца авангардная роля маладых камуністаў у грамадскім жыцці студэнцтва.

Усе члены КПСС добрасумленна адносіліся да выканання сваіх непасрэдных абавязкаў як у вучобе, так і ў грамадскай рабоце. Але павесці за сабой астатніх студэнтаў патоку яны не змаглі. Практычна ніякога ўдзелу маладыя камуністы не прымалі ў дзейнасці студэнцкага самакіравання, што, натуральна, негатыўна адбілася на яго рабоце.

На сходзе было выказана пажаданне актывізаваць работу партыйнай групы ў новым навучальным годзе, павысіць яе авангардную ролю.

Новым партгрупоргам на сходзе выбрана студэнтка 4-га курса эканомфака Ірына Жукоўская.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацыі і гутарак сярод студэнтаў у чэрвені 1987 года.**

**ДА 70-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ**

**1. Пераемнасць ідэй і справы Кастрычніка — палітычная лінія партыі.**

**2. Рэальныя правы і свабоды грамадзян сацыялістычнага грамадства — выдатная заваёва Вялікага Кастрычніка.**

Матэрыялы публікуюць газеты «Звязда», «Советская Белоруссия». Гл. таксама часопісы «Коммунист Белоруссии» № 5, «Коммунист» № 7 за 1987 год.

**НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ**

**3. Улада савецкая — улада народная** (Аб дэмакратызме нашага ладу, расшырэнні рэальнага ўдзелу працоўных у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства, фарміраванні органаў народаўладдзя ва ўмовах паглыблення сацыялістычнага самакіравання народа).

**4. Нашы кандыдаты** (Гутарка аб працоўных поспехах, дзелавых і маральна-палітычных якасцях кандыдатаў у дэпутаты).

**5. Усе на выбары!** (Аб гатоўнасці выбаршчыкаў выканаць свой высокі грамадзянскі абавязак — у дзень выбараў аддаць галасы за дастойных кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў.

Матэрыялы публікуюць усе газеты. Рэкамендуецца таксама выкарыстаць артыкулы па гэтай тэматыцы, апублікаваныя ў газетах «Правда» за 8, 15 мая, «Советская Белоруссия» за 13 мая, «Известия» за 20 мая, часопісах «Политическое самообразование» № 5, «Политинформатор и агитатор» №№ 8, 9, «Агитатор» № 9 за 1987 год.

**6. Жыць і працаваць сумленна** (Аб патрыятычным абавязку кожнага савецкага чалавека чэсна і добрасумленна адносіцца да працы, выконваць свой службовы, грамадскі і маральны абавязак, займаць актыўную пазіцыю ў перабудове).

Гутарку рэкамендуецца будаваць на канкрэтных прыкладах і фактах з жыцця свайго калектыву.

**7. Дысцыпліне — гарантыю калектыву** (Аб шырокім распаўсюджанні ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі вопыту перадавых брыгад па калектыўнай маральнай і матэрыяльнай адказнасці за стан працоўнай і грамадскай дысцыпліны).

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці вывады і ўстаноўкі, якія змяшчаюцца ў пастанове ЦК КПСС «Аб руху за калектыўную гарантыю працоўнай і грамадскай дысцыпліны» (Гл. «Праўду» за 4 мая 1987 г.).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**8. Выхаванне дастойнай змены — наш агульны клопат** (У гутарцы расказаць аб удзеле свайго калектыву ў падрыхтоўцы падрастаючага пакалення да жыцця і працы, аказанні шэфскай дапамогі школе, у рабоце з дзецьмі і падлеткамі па месцы жыхарства).

Матэрыял публікуе «Настаўніцкая газета». Рэкамендуецца выкарыстаць апублікаваныя 16—17 мая г. г. у рэспубліканскім друку матэрыялы VII з'езда настаўнікаў Беларускай ССР.

**9. У імя шчасця народаў, захавання жыцця на Зямлі** (Аб мэтанакіраваных намаганнях КПСС і Савецкага ўрада па паляпшэнню адносін паміж дзяржавамі з розным сацыяльным ладам, аслабленню ваеннай канфрантацыі, стварэнню трывалага бяз'ядзернага свету.

Матэрыялы па гэтай тэматыцы апублікаваны таксама ў часопісе «Міжнароднае жыццё» №№ 4, 5, штотыднёвіку «За рубежом» № 19 за 1987 год.

**10. Капіталізм без прыкрас: непісьменнасць у Амерыцы** (Аб нізкім адукацыйным узроўні значнай часткі насельніцтва ЗША, аб антынароднай, антыгуманнай палітыцы кіруючых колаў, якая вядзе да росту колькасці непісьменных).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Агитатор» № 9 за 1987 год.

*Са спартыўнага летапісу Гомельшчыны*

# НА ШЛЯХУ ДА МАСАВАСЦІ

На VII з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1918 г. па дакладу У. І. Леніна было прынята рашэнне аб неабходнасці ўсеагульнай ваеннай падрыхтоўкі працоўных для абароны маладой Савецкай дзяржавы.

На аснове гэтага рашэння Усесаюзны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт 22 красавіка 1918 г. прыняў дэкрэт «Аб абавязковым абучэнні ваеннаму мастацтву». Састаўным элементам ваеннага абучэння і падрыхтоўкі рэзерваў для Чырвонай Арміі была прызнана фізічная культура. Дапрызыўнікі займаліся гімнастыкай, лёгкай атлетыкай, спартыўнымі гульнямі, фехтаваннем, лыжным спортам. Гэта добра бачна з праграмы Старадубскага павятовага Усенавуча, які ўваходзіў у той час у састаў Гомельскай губерні.

Уся тэрыторыя рэспублікі, за выключэннем чыгункі, была раздзелена на акружныя, палкавыя, ротныя, узводныя ўчасткі і павятовыя аддзяленні спорту і дапразыўнай ваеннай падрыхтоўкі, дзе арганізоўваліся спортцэнтры, а пры іх — клубы і гурткі. Так, у студзені 1919 г. на Гомельшчыне ствараюцца спартклубы і фізкультурныя ячэйкі пры аддзелах Усенавуча. Адкрылі гурткі ў Чэрыкаўскай школе II ступені імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, у якіх культываваліся гімнастыка, лёгкая і цяжкая атлетыка, гульні. Паўсюдна ствараюцца аддзелы Усенавуча, пры якіх арганізуюцца спортцэнтры з сеткай клубаў і фізкультурных ячэек. Акрамя аддзяленняў Усенавуча ў Гомелі ў той час налічваліся яшчэ тры самастойныя спартыўныя таварыствы: «Макабі», «Спорт» і «Яднанне».

У 1920 г. загадам Усенавуча пры Гомельскім гуртку «Спорт» былі адкрыты першыя дзіцячыя спартыўныя групы, дзе юнакі займаліся зімой гімнастыкай, а летам — лёгкай атлетыкай і баскетболам.

У гурткі і клубы Усенавуча прыйшлі дзесяткі тысяч юнакоў, у першых радах якіх былі камсамольцы. У Рэчыцы ствараецца спартыўна-гімнастычнае таварыства імя М. Падвойскага, у Навазыбкаве — таварыствы «Спорт» і «Маяк». Пры клубе чыгуначнікаў у г. Гомелі арганізуецца першы рабочы гурток гімнастыкі. Гэта былі першыя крокі сапраўды масавага фізкультурнага руху ў нашай вобласці.

Далейшае развіццё фізкультурнага руху праходзіла ва ўмовах напружанай работы ўсіх працоўных Гомельшчыны па аднаўленню разбуранай народнай гаспадаркі, недахопу паліва, хлеба, барацьбы з контррэвалюцыяй.

Рашэнні III з'езда РКСМ сталі праграмай далейшага развіцця фізічнай культуры. На з'ездзе У. І. Ленін гаварыў аб асноўных прынцыпах камуністычнага выхавання моладзі, якія былі пакладзены ў аснову савецкай сістэмы фізічнага выхавання. Выконваючы рашэнні з'езда, камсамол актывізуе сваю работу ў органах Усенавуча, а таксама прыступае да стварэння спартыўных гурткоў і ячэек.

У красавіку 1919 г. у Маскве адбыўся І Усерасійскі з'езд работнікаў фізічнай культуры, спорту і дапрызыўнай падрыхтоўкі. На ім было вырашана ствараць у краіне Саветы фізкультуры замест Усенавуча. І ў красавіку 1920 г. у Гомелі быў створаны гарадскі Савет фізкультуры ў саставе 8 чалавек пад старшынствам Рутkоўскага. Адной з важнейшых задач Савета была арганізацыя работы па падрыхтоўцы фізкультурных кадраў. Выкладчыкаў і інструктараў па фізвыхаванню ў той час не хапала. Таму былі арганізаваны курсы інструктараў фізкультуры. У ліку закончыўшых іх — старэйшыя беларускія спартсмены, арганізатары фізкультурнага руху на Гомельшчыне і ў рэспубліцы: В. Кубліцкі, З. Сініцкі, А Шарамецьеў, Г. Якабсон, П. Кашура, Я. Багданаў.

Да канца 1921 г. гарадскія і павятовыя камітэты камсамола Гомельшчыны прыступілі да шырокага стварэння камсамольскіх спартыўных гурткоў, якія затым аб'ядналіся ў адзіную арганізацыю «Чырвоны маладняк». За кароткі час гурткі «Чырвонага маладняка» былі арганізаваны ў Рэчыцы, Калінкавічах, Рагачове, Добрушы, Навазыбкаве. Гэтыя гурткі сталі найбольш масавымі фізкультурнымі арганізацыямі Гомельшчыны.

З 1923 г. у работу па фізічнай культуры ўключыліся прафесіянальныя саюзы. Ствараюцца вытворчыя гурткі на чыгуначнай станцыі «Гомель», гурток «Спартак» пры клубе будаўнікоў у Нава-Беліцы, у Навазыбкаве пры фабрыцы «Вялікая рэвалюцыя», у Рэчыцы, Жлобіне, Рагачове, Гомелі.

У гарадах і паветах праводзяцца спаборніцтвы па футболу, баскетболу, лёгкай атлетыцы і іншых відах спорту. Адбылася Чэрыкаўская алімпіяда па лёгкай атлетыцы і футболу. Гомельскі гурток «Спорт» прыняў удзел у міжгарадскіх спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, гімнастыцы.

У пачатку 1924 г. былі створаны Гомельскі губернскі і павятовы Саветы фізкультуры. Спартыўныя гурткі перадаюцца ведамствам (прафсаюзам), органам народнай асветы і г. д. У школах уводзяцца ўрокі фізкультуры, у штаце органаў народнай асветы была зацверджана пасада інспектара па фізічнаму выхаванню.

У Гомелі закончылася будаўніцтва гарадскога стадыёна на месцы былога Максімаўскага парку (цяпер стадыён «Гомсельмаш»), спартыўнае ядро якога акаймлялі драўляны велатрэк і трыбуны. На свяце акрыцця стадыёна адбыліся таварыскія сустрэчы лёгкаатлетаў і футбалістаў Гомеля са спартсменамі Кіева.

Багаты быў спартыўнымі падзеямі для Гомеля 1927 год. Пераканаўчай перамогай гомельскіх спартсменаў закончылася праходзіўшае ў нашым горадзе III Усебеларускае свята фізічнай культуры. У ім прымалі ўдзел спартсмены чэхаславацкага рабочага клуба «Сокал». Гэта была першая міжнародная сустрэча спартсменаў Гомельшчыны. Гамяльчане заваявалі агульнакаманднае першынство ў спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы і плаванню.

У гэтым жа годзе зборная каманда футбалістаў Гомельшчыны правяла сваю першую міжнародную сустрэчу са зборнай камандай рабочых клубаў г. Лейпцыга.

Вялікай спартыўнай падзеяй у жыцці краіны з'явілася Усесаюзная Спартакіяда 1928 г., прысвечаная І пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі і 10-годдзю савецкага фізкультурнага руху. Разам з усімі саюзнымі і аўтаномнымі рэспублікамі паслала ў Маскву сваіх лепшых прадстаўнікоў і Беларусь. У саставе зборнай каманды рэспублікі была вялікая група гамяльчан.

9 ліпеня 1930 г. ЦВК БССР зацвердзіў палажэнне аб раённых Саветах фізкультуры, якія пераўтварыліся ў дзяржаўныя органы з шырокімі правамі ў галіне фізічнай культуры і спорту. Гэтым быў значна ўмацаваны фізкультурны рух у рэспубліцы. Да канца года раённыя Саветы фізкультуры ўтварыліся і на Гомельшчыне.

У 1929 г. у Мінску пачаў работу тэхнікум фізічнай культуры — першая навучальная ўстанова рэспублікі па падрыхтоўцы спецыялістаў фізічнай культуры. Сярод выкладчыкаў тэхнікума былі і гамяльчане — В. Дароўскі і В. Кубліцкі.

У 1931 г. па ініцыятыве Ленінскага камсамола быў уведзены комплекс «Гатоў да працы і абароны» І ступені. Як сведчаць дакументы, фізкультурнікі Гомеля паспяхова авалодвалі нарматывамі комплексу.

Фізкультурнікі ўнеслі вялікі ўклад у рашэнне эканамічных задач, пастаўленых партыяй перад рэспублікай.

**В. СЕЛІВАНАЎ,**
**ст. выкладчык кафедры тэарэтычных асноў фізвыхавання, кіраўнік навуковай групы па вывучэнню гісторыі спорту Гомельшчыны.**



СІЛУЭТЫ СЕСІІ. Фотаэцюд **А. Ульянкінай.**

СПОРТ

## ВЫКАНАЎ МАЙСТАРСКІ НАРМАТЫЎ

У г. Магілёве адбыўся чэмпіянат БССР па вольнай барацьбе. Гонар зборнай каманды прафсаюзаў рэспублікі абараняла 5 студэнтаў нашага універсітэта. Найбольш паспяхова выступіў у цяжкай вагавай катэгорыі другакурснік фізічнага факультэта Юрый Трацэнка. Ён выйграў чатыры паядынкі. У трох з іх атрымаў перамогу над майстрамі спорту. Юрыя напаткала няўдача толькі ў сустрэчы з сынам славутага беларускага асілка трохразовага алімпійскага чэмпіёна А. Мядзведзя—Аляксеем, які і стаў чэмпіёнам. Тым не менш Ю. Трацэнку чэмпіянат прынёс вялікую радасць: Юрый выканаў нарматыў для прысваення яму ганаровага звання «Майстар спорту СССР». У гэтым ён абавязан сваім трэнерам В. А. Калядзе і А. В. Хатылёву.

(Наш кар.).

## ПРЫКЛАД ПАКАЗАЎ Г. САМУСЁЎ

На працягу двух дзён праходзілі спаборніцтвы лёгкаатлетаў ГДУ па праграме універсіяды. У іх прыняло ўдзел 111 аматараў «каралевы спорту». У агульным заліку пераможцамі сталі спартсмены факультэта фізвыхавання. На наступных месцах размясціліся адпаведна каманды эканамічнага, фізічнага, матэматычнага, біялагічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў.

Студэнты мераліся сіламі ў бегавых відах праграмы, у скачках у даўжыню і вышыню, штурханні ядра. Найбольш вызначыўся слухач падрыхтоўчага аддзялення Г. Самусёў, які выступаў за каманду будучых эканамістаў. Ён выйграў тры дыстанцыі: 100, 200 і 400 м, паказаўшы адпаведна 10,9; 22,6; 50,2 сек. Усе гэтыя вынікі блізкія да першага спартыўнага разрада. Дасягненні астатніх пераможцаў адпавядаюць у асноўным другому і трэцяму спартыўным разрадам.

**В. КАЛАЧОЎ,**
**галоўны сакратар спаборніцтваў.**

## П А Д В Я Л І

На стадыёне Гомельскага кааператыўнага інстытута праведзены фінальныя спаборніцтвы мацнейшых вучэбных груп ВНУ Гомельшчыны. За перамогу змагаліся студэнты ГДУ, ГКІ і ГПІ. Лёгкаатлеты спаборнічалі ў кіданні гранаты, бегу на 100 м і кросе на 2 000 м — для жанчын, 3 000 м — для мужчын.

Гонар нашага універсітэта абараняла група Ф-11 фізічнага факультэта. Яна павінна была выставіць, па ўмовах спаборніцтваў, 20 чалавек і мела ўсе магчымасці выйсці пераможцай. Аднак каманду падвялі яе мацнейшыя члены А. Салган, А. Балыка, В. Налягач. Яны не з'явіліся на спаборніцтвы, не прынеслі значнай колькасці ачкоў і ў выніку іх таварышы, якія выступалі дружна і старанна, тым не менш аказаліся апошнімі — на трэцім месцы.

**Г. БАРАДЗІНА,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**


## ІНФАРМУЕ СЛУЖБА НТІ

10-га чэрвеня ў 14 гадзін Гомельскі ЦНТІ (пр. Леніна, 3) праводзіць пастаянна дзеючы семінар маладых вынаходнікаў.
Запрашаюцца грамадскія інфарматары кафедр (лабараторый).


# ХВАРОБА ВЕКУ: РЭАЛЬНАСЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВЫ БАРАЦЬБЫ

*Гутарка вучонага-медыка*

На ўсіх кантынентах нашай планеты вялікую трывогу выклікае цяпер новае захворванне — СПІД (сіндром набытага імуннага дэфіцыту). Яно адносіцца да інфекцыйных захворванняў, узбуджальнікам якога з'яўляюцца рэтравірусы. Па даных Е. В. Гембіцкага, Ю. Н. Карнаухава (1986) рэтравірусы ў малпаў выклікаюць падобныя захворванні. Іх эпідэмічным ачагом з'яўляюцца Цэнтральная Афрыка і асабліва народнасць банту (17,6%).

На канец 1986 года ў 110 краінах свету было зарэгістравана 36 тысяч 483 выпадкі гэтай хваробы. Дарэчы, у 1981 г. яна была адзначана ў ЗША толькі ў некаторых асоб. А цяпер тут прыкладна каля паўтара мільёна носьбітаў гэтай небяспечнай хваробы,

Ёсць генетычная схільнасць да гэтага захворвання галоўным чынам сярод цёмнаскурага насельніцтва. І наадварот, белае насельніцтва, а таксама жыхары азіяцкага кантынента хварэюць параўнаўча рэдка (Д. Балцімор).

Перадача захворвання адбываецца пры палавым кантакце, пераліванні крыві, пры ін'екцыях, калі стэрылізацыя медыцынскіх інструментаў парушана. Дзве трэція хворых СПІДам — гомасексуалісты.

Інкубацыйны перыяд (час ад пападання віруса ў арганізм і да з'яўлення клінічных сімптомаў) можа працягвацца ад трох месяцаў да трох гадоў, што ў значнай меры залежыць ад індывідуальных асаблівасцей арганізма. Наогул, распаўсюджванне захворвання ў многім падобнае на інфекцыйны гепатыт (хвароба Боткіна).

Клінічная карціна СПІДа разнастайная, што стварае вялікія цяжкасці для яго дыягностыкі. Тым не менш, у цяперашні час выдзелены дзве асноўныя формы гэтай хваробы — у выглядзе інфекцыйнага запалення лёгкіх (пнеўмацытнай пнеўманіі і саркомы Капошы (СК), якая паражае лімфатычныя вузлы, унутраныя органы і скуру).

Захворванне на першых стадыях мае агульныя сімптомы, характэрныя для вострай інфекцыі. Спачатку развіваецца перадспідная ліхаманка з тэмпературай 38—40°.

Адбываецца паражэнне лімфатычных вузлоў, галоўным чынам, шыйных, падсківічных, з'яўляюцца рэзкія болі ў мышцах і суставах. Развіваецца інтаксікацыя арганізма, патлівасць у начны час, што ў канчатковым выніку прыводзіць да малакроўя (анеміі), страты вагі і да агульнага цяжкага стану.

Улічваючы небяспечнасць названага захворвання для чалавецтва, у цяперашні час прыцягнуты ўсе лепшыя розумы ў розных краінах свету для барацьбы з ім. Так, у нашай краіне ў цэнтральных імуна-біялагічных лабараторыях вядуцца шматпрофільныя даследаванні па вывучэнню віруса гэтай хваробы, вывучаецца яго клініка і лячэнне. Ужо атрыман прэпарат для дыягностыкі захворвання. Апрабіруецца вакцына супраць СПІДа, праводзяцца даследаванні ў галіне гармальных прэпаратаў і г. д.

У ЗША створана спецыяльная камісія, якую ўзначальвае лаўрэат Нобелеўскай прэміі Д. Балцімор. Гэта камісія падлічыла, што колькасць захварэўшых да 1991 года складзе 270 тысяч чалавек, а ўлічваючы высокую лятальнасць пры гэтым захворванні — да 50%, стане зразумелым значэнне ўсяго сказанага.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя кіруе асобнымі лабараторыямі многіх краін свету. Па яе ініцыятыве створана Міжнароднае Еўрапейскае Таварыства па СПІДу з цэнтрам у Парыжы.

Прафілактыкай небяспечнага захворвання з'яўляецца шырокая прапаганда медыка-біялагічных ведаў сярод моладзі, лекцыйная прапаганда па сексуальных пытаннях, высокая санітарна-гігіенічная культура сярод насельніцтва.

**А. КАЛУГІН,**
**доктар медыцынскіх навук, прафесар.**


Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.**

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, ректората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 24482
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 394.